Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта
Дзяржайная ўстанова адукацыі
«Гродзенскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі»

*Конкурс*
*“Ніколі не забудзем: унукі пра вайну”*

# *“Пражыць жыцце з годнасцю”*

**Аўтар:**
Ключнік Сяргей Генадзевіч,13 лет
Петушок Гражына Сяргееўна, 14 лет
**Адрас:**
230029, Гродзенская вобласть,
г.Гродна, зав.Дзяржынскага, 17а,
каб. 504,Тел. (80152)485079
e-mail: cvrgrodroo@tut.by

**2014**

Кажуць, што ў вайны не жаночы твар. Але колькі жанчын прайшло праз усю вайну: ад яе першых дзён да перамогі!

Людміла Іосіфаўна Смілга нарадзілася і вырасла ў Ленінградзе. У яе былі клапатлівыя бацькі, таму сваё дзяцінства яна ўспамінае з цеплынёй і пяшчотай…



*Смілга Людміла Іосіфаўна – ветеран ВОВ*

У чатырнаццаць гадоў Людміла пайшла працаваць на швейную фабрыку. Гэта рашэнне яна прыняла самастойна: трэба было дапамагаць сям'і. Дзяўчыне прыйшлося сумяшчаць працу з вучобай. Лёс не песціў дзяўчыну. На долю яе пакалення выпала страшнае выпрабаванне – вайна. Вайна пазбавіла Людмілу бацькоў, забрала жыцці многіх сяброў, знаёмых, суседзяў. У блакадным Ленінградзе панавалі голад і палярная сцюжа. Як удалося выжыць юнай дзяўчыне ў горадзе, дзе смерць стала звычайнай з'вай, ведае толькі Бог.

Мабыць, вялікім было жаданне жыць, і гэта дало Людміле сілы вытрымаць суровае выпрабаванне.

Эвакуацыя… Праца ў тыле… У цяжкі для Радзімы час яна, як і тысячы маладых людзей, хацела быць там, дзе рвуцца снарады, свішчуць пулі. Добраахвотнікам Людміла пайшла на фронт, стала санітарам – інструктарам: яшчэ ў Ленінградзе яна скончыла курсы медсясцёр.

Свой першы бой Л.І.Смілга сустрэла пад Белгарадам. Гэта быў толькі пачатак гераічнага шляху. Людміла Іосіфаўна прыняла ўдзел у вызваленні іншых гарадоў: Смаленска, Канатопа, Віцебска. Сотні параненых салдат і афіцэраў гэтая дзяўчына вынесла з поля бою на сваіх руках. За час вайны была тройчы паранена. За баявыя заслугі Смілга Л.І. была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага сцяга, медалём "За баявыя заслугі".

У Любаве, на беразе Балтыйскага мора, у 1945 годзе Людміла Іосіфаўна скончыла свой баявы шлях.

У Беларусь яна прыехала з мужам, якога сустрэла і пакахала яшчэ на вайне. З тых пор жыве і працуе ў Скідзелі. Тут яна нарадзіла дзвюх выдатных дачок - Святлану і Ларысу.

Сваю працоўную дзейнасць Людміла Іосіфаўна пачала на прамысловым камбінаце, працавала майстрам цэха.

У 1961 годзе яна прыйшла ў сярэднюю школу №2 горада Скідзеля, дзе атрымала пасаду настаўніка працы.

Яна не проста выкладала, яна вучыла міласэрнасці, прыгажосці. Калі чалавек вялікі душой, то ён вялікі і сваімі справамі: ён каваль, цясляр, паэт ці настаўнік – гэта не мае значэння.

І на мірнай ніве ў Людмілы Іосіфаўны ёсць узнагароды: граматы Міністэрства асветы БССР, абласнога і раённага аддзелаў народнай адукацыі.

У 1979 годзе Людміла Іосіфаўна пайшла на пенсію. Некаторы час яна ўзначальвала Савет ветэранаў пры Скідзельскім гарадскім выканаўчым камітэце. І тут гэтая жанчына шмат чаго дасягнула, прыцягваючы ўвагу грамадскасці да патрэб былых абаронцаў Радзімы. Яна бескарыслівa клапацілася пра людзей і нічога не прасіла для сябе.

Цяпер Людміле Іосіфаўне 90 гадоў. Але энергія, аптымізм, вера ў свае сілы не пакідаюць яе. Яна па – ранейшаму імкнецца дарыць людзям любоў і радасць. У цяперашні час яна ўзначальвае Камітэт каталіцкай царквы горада Скідзеля, ні адно рэлігійнае свята не абыходзіцца без яе актыўнага ўдзелу.

Смілга Людміла Іосіфаўна ніколі не рабіла стаўкі на поспех. Сіла духу, непахісная воля, бясконцая працавітасць, аптымізм, любоў да Радзімы – вось тыя якасці, якія дапамаглі гэтай жанчыне пераадолець усе жыццёвыя нягоды. Пражыць сваё жыццё з годнасцю – гэта вялікая справа.

*(аўтар: Петушок Гражына Сяргееўна)*

Много лет, как кончилась война,
Но не забывается она.
Кажется, как будто лишь вчера
Полыхала страшная заря.

Санинструктор, девочка ещё,
Подставляет раненым плечо.
И кричит солдат: «Спаси меня,
Вытащи из ада и огня!»

«Подожди, солдат, перевяжу,
Только ты живи, тебя прошу!»
И опять сквозь дым она бежит,
А в воронке раненый лежит.

Рвутся мины, слышен пулемёт,
Но солдаты вырвались вперёд
И за Родину вступили в бой…
Так обидно умирать весной.

Вспоминая страшную войну,
Мы всё больше ценим тишину,
Солнца свет, родительский порог
Помним тех, кто этот мир сберёг!

*(автор: Ключник Сергей Геннадьевич)*



*Ключник Сергей Геннадьевич*



*Петушок Гражына Сяргееўна*